# У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАСЦІ


Фота БЕЛТА.

## Пляцоўка для дыялогу

«Думаю, не будзе перабольшаннем сказаць, што з часу заканчэння халоднай вайны еўрапейская архітэктура бяспекі яшчэ не перажывала такога сур'ёзнага сістэмнага крызісу. Больш за тое, адсутнічаюць бачныя прыкметы гатоўнасці да пошуку кампрамісаў», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён адзначыў парадаксальнасць таго факта, што ўсеагульны запыт на эканамічную інтэграцыю неймаверным чынам спалучаецца з новымі праявамі размежавання, абмежаванням у гандлі і санкцыямі. «Сітуацыя сёння на ўсёй прасторы АБСЕ характарызуецца перманентным сутыкненнем інтарэсаў. Існуе дэфіцыт разумення адно аднаго па самым шырокім коле ключавых пытанняў. На нашых вачах зноў узнікаюць геапалітычныя разломы. Абвастраюцца або тлеюць замарожаныя канфлікты. Яўна або скрыта расце напружанасць у ваеннай сферы, зноў павялічваюцца расходы на яе ўтрыманне», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем канстатаваў, што не ўдаецца знайсці агульныя падыходы і кансалідаваць намаганні ў барацьбе з тэрарызмам, некантралюемай міграцыяй і кіберзлачыннасцю.

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што ў Беларусі заўсёды лічылі і лічаць прынцыпова важным актыўна ўдзельнічаць у рабоце АБСЕ. «Упэўнены, што пляцоўка АБСЕ можа быць выкарыстана для наладжвання дыялогу паміж рознымі эканамічнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, у першую чаргу паміж Еўрапейскім саюзам і Еўразійскім эканамічным саюзам. А таксама паміж Еўрапейскім саюзам, Еўразійскім эканамічным саюзам і Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва, якая ўсё больш набірае сваю вагу, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — АБСЕ ў ліку прыярытэтаў вызначыла тэматыку эканамічнай узаемазвязанасці, спалучанасці эканомік. Мы асабліва зацікаўлены ў такім збліжэнні і называем яго «інтэграцыя інтэграцый».

«Беларусь выступае за пабудову справядлівай, прадказальнай і надзейнай гандлёва-эканамічнай архітэктуры ў Еўропе і ў цэлым на еўра-атлантычнай прасторы», — заявіў Прэзідэнт. Ён таксама адзначыў, што Беларусь заўсёды была прыкладам міралюбнасці і талерантнасці. Сёння краіна ўсё больш усведамляецца як полюс стабільнасці ў Еўрапейскім рэгіёне, і гэты фактар будзе толькі ўзрастаць, упэўнены Прэзідэнт.

«Мінск стаў прызнанай перагаворнай пляцоўкай па ўрэгуляванні і крызісу ў нашай суседцы, нашай брацкай Украіне. Мы цалкам падтрымліваем дзейнасць трохбаковай кантактнай групы і спецыяльнай маніторынгавай місіі АБСЕ ва Украіне. Мы і надалей будзем рабіць усё неабходнае, каб у гэтай дзяржаве настаў мір, — запэўніў беларускі лідар. — Мы будзем абавязкова дзейнічаць у рамках дамоўленасцяў, перш за ўсё Расіі і Украіны, па гэтых праблемах. Мы ні ў якім разе не збіраемся бегчы наперадзе. Мы абавязкова будзем выконваць тое, аб чым дамаўляюцца канфліктуючыя бакі і дзяржавы, якія з'яўляюцца донарамі стабільнасці ва ўкраінскай дзяржаве».

## Новы Хельсінкскі працэс

Прэзідэнт Беларусі прапанаваў пачаць у рамках АБСЕ дыскусію аб неабходнасці арганізацыі новага Хельсінкскага працэсу. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, відавочна неабходнасць абнаўлення агульнаеўрапейскага дыялогу па ўмацаванні мер даверу, бяспекі і супрацоўніцтва. «Пры гэтым трэба ўлічыць вялікі пазітыўны вопыт Хельсінкскага працэсу 70-х гадоў, які сведчыць, што дзейнічаць трэба на апярэджанне, а не прымаць рашэнні пастфактум. Усё гэта вымушае гаварыць аб актуальнасці ідэі запуску новага Хельсінкскага працэсу. Гэта значыць, шырокага дыялогу, накіраванага на пераадоленне існуючых супярэчнасцяў ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі на нашай агульнай прасторы — у Еўра-Атлантыцы і Еўразіі», — сказаў Прэзідэнт.

«У канцы мінулага года я ўжо выпучаў ідэю новага перагаворнага працэсу, аналагічнага Хельсінкскаму. Пры гэтым, гаворачы аб такой маштабнай падзеі ў сённяшніх умовах, трэба, што называецца, трымаць у галаве пашыранне не фармату. Магчыма, за кошт падключэння новых удзельнікаў. Тут я ў першую чаргу маю на ўвазе КНР», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што новы Хельсінкскі працэс садзейнічаў бы заключэнню вядучымі сусветнымі дзяржавамі нейкага глабальнага дакумента, паставіў бы кропку ў халоднай вайне, якая даўно завяршылася, выключыўшы магчымасць яе аднаўлення і перарастання ў больш трагічную форму, абазначыў бы стратэгічнае бачанне новых канструктыўных адносін у рэгіёне АБСЕ.

«Мы разумеем, што сфармуляваць ужо цяпер прымальную для ўсіх бакоў мадэль такога ўмоўнага «Хельсінкі-2» няпроста. Таму спачатку важна вызначыць агульныя прынцыпы і мэты, якія задавальнялі б усіх, накіраваныя на ўмацаванне даверу як мінімум у палітычнай і ваеннай сферах. У іх ліку можа быць аб'яднанне намаганняў у барацьбе з тэрарызмам, зніжэнне напружанасці і прадухіленне ваеннай эскалацыі, каардынацыя дзеянняў па рэгуляванні міграцыйных працэсаў, а таксама захаванне кібербяспекі. Словам, мы павінны адрэагаваць на выклікі сучаснасці», — адзначыў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў важнасць спынення геапалітычнага саперніцтва ў рэгіёне, адмовы ад стварэння сфер уплыву і навязвання дзяржавам пэўнай мадэлі грамадска-палітычнага ладу. «Усім патрэбны спалучэнне інтэграцыйных працэсаў, выключна мірнае ўрэгуляванне спрэчак», — лічыць Прэзідэнт.

«У гэты працэс маглі б уліцца агульныя напрацоўкі ў рамках папярэдніх і цяперашніх ініцыятыў. Калі гэта будзе падтрымана, то ўжо ў наступным годзе можна было б аб'явіць аб правядзенні, скажам, у 2020 годзе на пляцоўцы АБСЕ пашыранай нарады ў рамках новага Хельсінкскага працэсу і пачаць падрыхтоўку да падагульняючага саміту. Мы выступаем за стварэнне групы аднадумцаў для пашырэння гэтай ідэі і маем намер выкарыстоўваць для праявы гэтай работы разам з АБСЕ і іншыя міжнародныя пляцоўкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што з улікам беларускага вопыту, і калі гэта будзе неабходна, Беларусь гатова стаць стартавай пляцоўкай для пачатку гэтага працэсу. «Хоць разумеем, што пытанні месца і часу з'яўляюцца асаблівай тэмай, якая патрабуе асобнага абмеркавання», — дадаў ён.

## Статут АБСЕ як перспектыва

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў пытанні правядзення выбараў не павінна быць ніякіх двайных стандартаў, калі, напрыклад, БДІПЧ АБСЕ прад'яўляе да розных дзяржаў розныя патрабаванні, а да асобных і зусім такіх патрабаванняў не ставіцца. «Постсавецкія рэспублікі, наколькі я памятаю, звярнуліся ў АБСЕ: давайце прымем статут АБСЕ (на дзіва, паважаная арганізацыя не мае свайго статута) і, калі размова ідзе аб выбарных працэсах і яны найбольш вострыя, якія выклікаюць сумненні ў еўрапейскіх дзяржавах, давайце выпрацуем пералік патрабаванняў да выбарнага працэсу. І па гэтых патрабаваннях будзем прад'яўляць прэтэнзіі або ўхваляць той ці іншы выбарны працэс. Але пакуль у нас і гэтага няма», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт звярнуў увагу, што асобныя міжнародныя назіральнікі па-свойму трактуюць выбарчы працэс у Беларусі, адсюль з'яўляюцца розныя патрабаванні.

Беларускі лідар дадаў, што апошнія гады ў нашай дзяржавы развіваецца даволі канструктыўны дыялог з БДІПЧ АБСЕ. «Для аналізу рэкамендацый Бюро, дадзеных па выніках праведзеных прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў, створана міжведамасная экспертная група. Яе напрацоўкі будуць выкарыстаны пры далейшым удасканаленні выбарчага заканадаўства і практыкі яго прымянення. Гэту работу мы маем намер праводзіць паступова, удумліва, без спешкі і шараханняў», — адзначыў ён.

«Мы гатовы вучыцца і вучымся ў тым ліку ў вас. Але без вокрыкаў і пануквання. Мы адкрыты для дыялогу, пераймаем замежны вопыт», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Пытанне бяспекі на БелАЭС

«Не планаваў падрабязна спыняцца на тэме Беларускай АЭС. Але ў адным з праектаў рашэнняў, прадстаўленых на ваш разгляд, прапаноўвалася выказаць «глыбокую занепакоенасць» тым, як мы будуем АЭС. Добра, што разважлівасць узяла верх і гэта рашэнне не было адобрана, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але я хацеў тут задаць адно пытанне тым, хто ўзнімае гэту тэму: мы што, адзіная краіна, якая будуе атамную электрастанцыю? Не. Мы што, валодаем дзясяткамі энергетычных атамных блокаў? Не!»

«Я гарантую вам, еўрапейцам, нягледзячы на тое, што мы не адзіная краіна, якая займаецца мірным атамам: мы пабудуем самую бяспечную станцыю. У нас пасля катастрофы ў Чарнобылі не так проста было прыняць гэта рашэнне. І мы разумеем сёння, што галоўнае пытанне — бяспека. Тое, што хвалюе і еўрапейцаў, і нашых суседзяў. Мы маем намер завяршыць будаўніцтва гэтай станцыі ў тэрмін з няўхільным выкананнем нормаў і стандартаў МАГАТЭ», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама праінфармаваў, што пасля закрыцця Ігналінскай АЭС у Літве Беларусь запрасіла грамадзян гэтай краіны, якія жадаюць працаваць на БелАЭС. «І многія літоўцы, спецыялісты, атамшчыкі, прыехалі да нас працаваць», — адзначыў ён.

Да таго ж Беларусь прапанавала літоўскаму боку сумесна будаваць БелАЭС. «Літоўская Рэспубліка часта ўзнімае гэта пытанне. Я гэта нармальна ўспрымаю. І нядаўна літоўцам прапанаваў: ну, калі мы будзем сварыцца з-за гэтай станцыі, давайце яе разам пабудуем і будзем эксплуатаваць як беларуска-літоўскую станцыю. Каб яна забяспечвала электраэнергіяй і Беларусь, і Літву. Калі трэба — Латвію, Эстонію, Польшчу і іншыя дзяржавы. Гэта ж самы танны від электрычнай энергіі», — нагадаў Прэзідэнт.

«Мы лічым, што гэта пытанне палітызавана. Давайце сядзем разам, разбяромся як мае быць у гэтым пытанні і здымем яго, не будзем смяшыць увесь свет. Нам, Літве і Беларусі, патрэбна гэта станцыя», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён таксама нагадаў, што ў Літве доўга функцыянавала Ігналінская АЭС, працэс вывядзення якой з эксплуатацыі працягваецца. «Але мы ж ніколі не ўзнялі пытанне аб тым, што яна небяспечная. Хоць мы ад гэтай старой станцыі атрымлівалі шмат негатыўных працэсаў. Ваду для ахалоджвання гэта станцыя атрымлівала з Беларусі. І скід адпрацаванай вады ішоў таксама ў Беларусь. Мы разумелі: патрэбны час для таго, каб вырашыць гэта пытанне. Разумеем і цяпер», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

## Смяротная кара і свабода СМІ

Па словах Прэзідэнта, у пытанні смяротнай кары беларуская дзяржава не можа пайсці супраць волі народа. «Нас заклікаюць да адмены смяротнай кары. Мы гэтыя прапановы чуем, і не толькі чуем. Але супраць волі народа, пераважная частка якога на рэферэндуме выказалася за яе захаванне, ні адна дзяржава пайсці не можа. Ні адна цывілізаваная еўрапейская дзяржава», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуўся да тэмы свабоды сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі. «Актыўна развіваецца медыйная прастора Беларусі, на якой прысутнічаюць СМІ розных формаў уласнасці і палітычных поглядаў. Ушчамленне свабоды СМІ, якое нібыта мае месца ў нашай краіне, — гэта клішэ з арсенала мінулага. У век інтэрнэту гэта наогул пазбаўлена ўсялякага сэнсу, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — А ў плане развіцця інтэрнэту і яго даступнасці вы нас ніколі не папракнеце».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў Беларусі кругласутачна вяшчаюць шматлікія замежныя каналы, у тым ліку «Еўраньюс» і буйныя расійскія тэлеканалы. «Са СМІ ў нас праблем няма. Я яшчэ раз падкрэсліваю: той, хто хоча ведаць аб тым, што адбываецца ў свеце, ведае», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПРАЗ ДАВЕР ДА РОСКВІТУ

**На адкрыцці сесіі ПА АБСЕ акрэслілі мэты супрацоўніцтва**

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў сваім выступленні на адкрыцці 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ адзначыў, што беларускія парламентарыі гатовы падтрымліваць пачынанні, якія садзейнічаюць умацаванню даверу і развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Канструктыўны падыход неабходны для вырашэння самых складаных пытанняў. Дарэчы, у дні сесіі запланаваны шэраг двухбаковых сустрэч паміж парламентарыямі.**

«Толькі адкрыты і раўнапраўны дыялог дапаможа развязаць тугі клубок міжнародных праблем і даць людзям тое, у чым яны маюць патрэбу. Перш за ўсё — мірнае неба, стабільнасць і дабрабыт», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. У сваім выступленні старшыня Палаты прадстаўнікоў закрануў такія сучасныя праблемы, як рост тэрарыстычных актаў, вялікія патокі бежанцаў і страта эфектыўнасці сучаснай сістэмы міжнародных адносін. Выхадам з існуючай сітуацыі могуць стаць новыя падыходы, якія развіваюць дух хельсінкскіх пагадненняў і гарантуюць суверэнныя права народаў.

**Старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ Крысцін МУТАНЕН** адзначыла, што давер і супрацоўніцтва — гэта сродкі для дасягнення міру і росквіту. І іх неабходна ўмацоўваць. Сумесная работа на сесіі ПА АБСЕ дапаможа аднавіць сувязі паміж краінамі. Крысцін Мутанен нагадала, што Беларусь займае асаблівае месца ў Еўропе як геаграфічна, так і палітычна. А беларуская дэлегацыя даўно вельмі актыўна дзейнічае ў Парламенцкай асамблеі АБСЕ, асабліва па пытаннях, звязаных з эканомікай і навакольным асяроддзем.

Наша сталіца зарэкамендавала сябе як месца работы міжнароднай дыпламатыі і ўрэгулявання канфліктаў. Сустрэчы, якія праходзяць у гэтыя дні ў Мінску, звязаныя ў тым ліку з абмеркаваннем шляхоў выхаду з канфлікту на ўсходзе Украіны. Крысцін Мутанен звярнула ўвагу на тое, што мінскія пагадненні павінны выконвацца поўнасцю. Сярод іншых тэм, якія будуць закрануты падчас сесіі, можна вылучыць змяненне клімату, забеспячэнне правоў чалавека, кібербяспеку і барацьбу з карупцыяй.

Калі Себасцьян Курц стаў Дзеючым старшынёй АБСЕ, ён вызначыў тры мэты арганізацыі: пакончыць з канфліктамі, аднавіць давер і пераадолець праблему радыкалізацыі і тэрарызму. На прыкладзе Украіны можна казаць, што місія назіральнікаў АБСЕ зараз запатрабавана, неабходна імкнуцца да стабільнасці ў гэтым рэгіёне. **Дзеючы старшыня АБСЕ, міністр замежных спраў Аўстрыі Себасцьян КУРЦ** пагадзіўся, што за апошнія гады давер паміж дзяржавамі не вырас, а ў некаторых сітуацыях нават знізіўся. Радыкалізацыя адбываецца не толькі па-за межамі АБСЕ, але і ўнутры грамадстваў. І блокавае мысленне вяртаецца на кантынент. Себасцьян Курц звярнуў увагу на тое, што неабходна зрабіць усё магчымае для аднаўлення дыялогу і развіцця розных формаў узаемадзеяння. У рамках Парламенцкай асамблеі ідзе пастаянная работа паміж дэпутатамі — гэта становіцца асновай для забеспячэння пазітыўнай будучыні на прасторы АБСЕ.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*